# ВІНШУЕМ З ДНЁМ ПЕРАМОГІ!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
27 красавіка
1995 года
№ 7(1725)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА


## Праблемы падлетка — на дзяржаўны ўзровень

Ужо трэці год стаіць пытанне аб стварэнні Рэспубліканскай службы прафарыентацыі моладзі і надання ёй дзяржаўнага статуса. Ажыццявіць гэта плануецца на базе Мінскага гарадскога цэнтра прафарыентацыі моладзі (МГЦПМ). Мінскі ЦПМ існуе ўжо восьмы год і працуе па двух напрамках: аказанне інфармацыйных паслуг і кансультацыйнай дапамогі. На 1-м этапе збіраецца інфармацыя аб прафесіях, умовах прыёму ў навучальныя ўстановы, конкурсах, а таксама інфармацыя аб стане рынку працы і аб запатрабаванніх рынку ў спецыяльнасцях і прафесіях. Штогод інфармацыя абнаўляецца і распаўсюджваецца па ўсіх прафкансультацыйных пунктах, якіх у Мінску сёння 11. Другі этап — сувязь напрамую з кліентамі, правядзенне групавых і індывідуальных кансультацый у выпускных класах. Дарэчы, толькі за мінулы год групавыя кансультацыі наведалі звыш 20 тысяч чалавек. У штаце цэнтра — псіхолагі, прафкансультанты, сацыёлагі, фізіёлагі. Усе паслугі — бясплатныя.

МГЦПМ супрацоўнічае з Цэнтрам занятасці, з Рэспубліканскім падлеткавым кабінетам, Упраўленнем народнай адукацыі, Мінгарвыканкамам. Рэгулярна, адзін раз у год, праводзіцца анкета «Зваротная сувязь». Па выніках 1994-га года, 70% старшакласнікаў паслугі цэнтра дапамаглі, каля 30% у выбары прафесіі кіраваліся непасрэднa парадамі кансультанта.

Паслугамі цэнтра карыстаюцца не толькі жыхары Мінска. Сюды звяртаюцца з розных мясцін рэспублікі — з Пухавіч, Бараўлян і Жодзіна, Смалявіч і Барысава, шмат наведвальнікаў з іншых абласцей. Як бачым, стварэнне Рэспубліканскай службы прафарыентацыі моладзі — пытанне вельмі надзённае, патрабуе ўвагі і неадкладнага вырашэння.

**Святлана ШАБЛІНСКАЯ.**

## ● БЯРЫ ДА ГАЛАВЫ

Днямі студэнцкае бюро маладзёжнай сацыяльнай службы сталіцы, якое ўзначальвае студэнт 3 курса гістфака БДУ Уладзімір Заброцкі, правяло сход студэнтаў, што выказалі жаданне працаваць у вольны ад вучобы час. Яны будуць аказваць розныя побытавыя паслугі насельніцтву, выконваць працу па ачыстцы вуліц і скавераў, будуць працаваць санітарамі, рознарабочымі і гэтак далей.

Праца, шчыра кажучы, не дужа інтэлектуальная, але тыя, хто мае патрэбу зарабіць хоць трошкі грошай да невялікай стыпендыі, могуць звяртацца па тэлефоне: 33-19-18.

**А. КЛАСКОЎСКІ, вучань 11 класа СШ № 55.**

## ● НАШЫ ГОСЦІ

20-га красавіка Белдзяржуніверсітэт наведаў рэктар МДУ імя М. В. Ламаносава, член-карэспандэнт РАН **Віктар Антонавіч САДОЎНІЧЫ.** Па выніках візіта быў падпісаны Дагавор аб навуковым, вучэбным і культурным супрацоўніцтве паміж БДУ і МДУ.

В. А. Садоўнічаму было прысуджана званне ганаровага доктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта за выдатныя дасягненні ў галіне матэматыкі і вялікі ўклад у падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для Рэспублікі Беларусь.

**А. КЛАСКОЎСКІ, вучань 11 класа СШ № 55.**



*Фота Г. А. КРАСКОЎСКАГА.*

## Дагавор аб навуковым, вучэбным і культурным супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава

Беларускі дзяржаўны універсітэт і Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава, абапіраючыся на свае універсітэцкія традыцыі і плённыя сувязі, якія склаліся гістарычна, пагадзіліся скласці і падпісаць сапраўдны Дагавор.

**Артыкул 1**

Абодва Бакі, згодна сваіх Статутаў і ў рамках існуючых магчымасцей, будуць развіваць на падставе раўнапраўя і ўзаемнай выгады супрацоўніцтва ў розных сферах універсітэцкага жыцця, уключаючы ў яго і ўсіх членаў універсітэцкай садружнасці — выкладчыкаў, вучоных, студэнтаў, аспірантаў, другіх супрацоўнікаў.

**Артыкул 2**

Абодва Бакі будуць супрацоўнічаць у галіне выкладання праз арганізацыю абмену выкладчыкамі для чытання лекцый і вядзення педагагічнай работы, абмену вучэбна-метадычнай літаратурай і інфармацыяй па вучэбных планах і праграмах.

**Артыкул 3**

Абодва Бакі будуць супрацоўнічаць у галіне навуковай работы праз арганізацыю сумесных навуковых даследванняў па ўзаемаўзгодненай тэматыцы і абмен вучонымі, развіваючы і падтрымліваючы прамыя кантакты паміж кафедрамі, лабараторыямі і другімі навуковымі падраздзяленнямі.

Абодва Бакі будуць абменьвацца публікацыямі і другімі навуковымі матэрыяламі, інфармаваць адзін аднаго аб навуковых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў сваіх універсітэтах і запрашаць прадстаўнікоў другога Боку для ўдзелу ў гэтых мерапрыемствах.

**Артыкул 4**

Абодва Бакі будуць арганізоўваць абмен студэнтамі, аспірантамі і стажорамі і прадастаўляць ім неабходныя ўмовы для паглыблення тэарэтычных і практычных ведаў.

**Артыкул 5**

Абодва Бакі будуць развіваць і падтрымліваць супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі абодвух універсітэтаў, у тым ліку абмен навуковай і вучэбнай літаратурай і абмен супрацоўнікамі бібліятэк.

**Артыкул 6**

Абодва Бакі будуць супрацоўнічаць у галіне універсітэцкай палітыкі і кіравання, арганізоўваць абмен супрацоўнікамі ў гэтай сферы дзейнасці для абмену вопытам работы і падвядзення вынікаў міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва.

**Артыкул 7**

Сапраўдны Дагавор не выключае другіх форм супрацоўніцтва, якія могуць быць прапанаваныя для абмеркавання па ініцыятыве кожнага з дагаворных Бакоў, а таксама могуць быць дапоўнены або зменены па пісьмовай дагаворнасці абодвух Бакоў.

Якія-небудзь змены ў сапраўдным Дагаворы не могуць быць ажыццёўлены без пісьмовага ўведамлення ўдзельнікаў супрацоўніцтва, якія выконваюць бягучую праграму.

**Артыкул 8**

Для рэалізацыі палажэнняў сапраўднага Дагавору абодва Бакі будуць распрацоўваць і зацвярджаць Рабочыя праграмы супрацоўніцтва тэрмінам на 3 гады, у якіх будуць указаны канкрэтныя формы, навуковыя тэмы, тэрміны і квоты супрацоўніцтва, а таксама парадак і ўмовы яго арганізацыі і фінансавання.

**Артыкул 9**

Тэрмін дзеяння сапраўднага Дагавору — 6 гадоў.

Кожны з Бакоў можа перарваць дзеянне сапраўднага Дагавору, дзеля чаго пісьмова ўведамляе аб сваім рашэнні другі Бок не пазней, чым за 6 месяцаў да прыпынення тэрмінаў дзеяння сапраўднага Дагавору.

**Артыкул 10**

Сапраўдны Дагавор уступае ў сілу са дня яго падпісання ўпаўнаважанымі на гэта прадстаўнікамі абодвух Бакоў.

Сапраўдны Дагавор прадстаўлен у дзвюх версіях на беларускай і рускай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

Дата: 19 красавіка 1995 г. Месца: г. Мінск.

За Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава рэктар член-карэспандэнт РАН, прафесар В. А. Садоўнічы.

За Беларускі дзяржаўны універсітэт рэктар акадэмік АН Беларусі, прафесар Ф. М. Капуцкі.

## ● КОНКУРС

**УСЛОВИЯ ПРОВЕДЕНИЯ III ТУРА УЧЕБНИКОВ, УЧЕБНЫХ И МЕТОДИЧЕСКИХ ПОСОБИЙ ПО ПРОГРАММЕ БЕЛОРУССКОГО ФОНДА СОРОСА «ОБНОВЛЕНИЕ ГУМАНИТАРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ»**

Конкурс проводится Белорусским Фондом Сороса.

Цель конкурса — совершенствование учебно-методического обеспечения всех уровней гуманитарного образования. К участию в нем допускаются как белорусские, так и зарубежные авторы, авторские коллективы, победители II тура конкурса, а также другие авторы, которые представят ранее не публиковавшиеся рукописи.

На конкурс принимаются рукописи учебников, учебно-методических комплексов, пособий для учителей, воспитателей, преподавателей вузов по всем предметам гуманитарного цикла.

Представленные рукописи должны быть полностью завершены и подготовлены к изданию.

Все конкурсные материалы представляются в 2-х экземплярах. Объем рукописи не должен превышать 15 печатных листов (350—360 стр. машинописного текста); для хрестоматий, антологий и книг подобного жанра могут быть исключения.

Вместе с рукописью должны быть представлены: а) аннотация — 1 стр.; б) сведения об авторах (фамилия, имя, отчество, домашний адрес, телефон, место работы, сфера научной деятельности, девиз соискателя). Сведения об авторах помещаются на отдельном листе.

Все конкурсные материалы обозначаются девизом соискателя.

Рукописи, получившие положительную оценку III тура, будут опубликованы Фондом Сороса пробным тиражом.

Срок подачи рукописей на III тур конкурса с 1 по 10 сентября 1995 года.

Адрес: 220005, Минск, ул. Козлова, 7, кв. 101. Белорусский фонд Сороса. Тел. 33-04-61.

**ПРОГРАММА «ОБНОВЛЕНИЕ ГУМАНИТАРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ»**

Фонд Сороса-Беларусь приглашает издательства, имеющие лицензии на издание учебной литературы, принять участие, на конкурсной основе в создании нового поколения учебников по гуманитарным дисциплинам (экономика, политология, социология, философия, белорусская филология, русская и общая филология, богословие, искусство, культурология, история, психология, педагогика).

Обращаться по адресу: 220005, г. Минск, ул. Козлова 7, кв. 101, тел. 33-04-61.

# ДА 50-ГОДДЗЯ

## ● КАНФЕРЭНЦЫІ

Час бяжыць няўмольна, не ўзгадняючыся ні з жаданнямі, ні з дзеяннямі людзей. Ужо папраўка на час — пяцьдзесят. Менавіта столькі гадоў мы святкуем Вялікі Дзень Перамогі.

6 красавіка на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі адбылася студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная гэтай даце. Студэнты паспрабавалі разгледзець розныя бакі вайны: «Еўрапейскае Супраціўленне і партызанскі рух у Беларусі», «Уклад рабочага класа і сялянства Беларусі ў разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «Студэнты і выкладчыкі БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Настаўнікі і школьнікі Беларусі ў баях за Радзіму», «Навука Беларусі ў гады вайны», «Невядомая вайна: пытанні савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг.» і іншыя.

У праграме канферэнцыі адбылася сустрэча студэнтаў ФПМІ з удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны генерал-маёрам Бокавым Барысам Філіпавічам.

**Ж. СІНІЦКАЯ**

## САКРЭТ ФІРМЫ

# КЛІЧА ВЯЗЫНКА!

Упраўленне па справах моладзі запрашае ўсіх ахвотных на студэнцкі фестываль «Белдзяржуніверсітэт-95». Сёлета ён прысвечаны 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Праграма фестывалю

19 мая

15.00 Ад'езд у Вязынку.

17.00 Спартыўныя мерапрыемствы.

Культурная праграма, дыскатэка да раніцы.

20 мая

9.00 Ад'езд гасцей у Вязынку.

Знаёмства з музеем — запаведнікам, кірмаш студэнтаў, аўкцыёны, атракцыёны.

13.00 Візіткі факультэтаў.

16.00 Спартыўныя спаборніцтвы (міні-футбол з удзелам мужчынскіх каманд, эстафета-сюрпрыз, першынства па турызму), прэс-канферэнцыя з адміністрацыяй БДУ, канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці, народныя гульні, дыскатэка да світанку.

21 мая

Сустрэча світанку.

Ад'езд гасцей і ўдзельнікаў фестывалю. Ад'езд турысцкіх каманд факультэтаў.

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**вучань 11 класа**
**СШ № 55.**

## ● СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# БДУ Ў ДНІ ВАЙНЫ



Калі пачалася вайна, у ВНУ і тэхнікумах рэспублікі закончваўся навучальны год. У Беларускім дзяржаўным універсітэце ішла заліковая сесія. Ранкам 22 чэрвеня, як толькі стала вядома аб пачатку вайны, студэнты і выкладчыкі, здольныя насіць зброю, з'явіліся ў ваенкаматы. Ужо ў першыя дні вайны 450 студэнтаў і выкладчыкаў сышлі на фронт.

Хуткабежны характар баявых дзеянняў не дазволіў эвакуіраваць універсітэт. 28 ліпеня 1941 года фашысты ўварваліся ў Мінск. Большая частка выкладчыкаў і супрацоўнікаў аказалася ў акупаваным горадзе.

У адпаведнасці з дырэктывай «Ост» вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы намячалася поўнасцю ліквідаваць. Усё, што не магло быць вывезена, знішчалася на месцы.

Дарэшты былі разбураныя навучальныя карпусы, інтэрнаты і жылыя дамы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Каштоўнае навуковае абсталяванне лабараторый і кабінетаў, архівы і бібліятэкі гітлераўцы вывезлі ў Германію або знішчылі. Была скрадзена найбагацейшая калекцыя карысных выкапняў Беларусі і Савецкага Саюза, якая належала універсітэту, знішчаныя заалагічны, геолага-мінералагічны і гісторыка-археалагічны музеі і найноўшае тэхнічнае абсталяванне. Так, Кубэ ў лісце ад 29 верасня 1941 года, адрасаваным Разенбергу, пісаў, у прыватнасці: «...знішчаны і разрабаваны прыборы каштоўнасцю ў мільёны марак».

Будынак біялагічнага факультэта фашысты прыстасавалі для свайго шпіталя і пачалі выкідваць на вуліцу экспанаты. Выкладчыкі біяфака дацэнт Е. М. Зубковіч, асістэнт А. В. Вязовіч, аспірантка З. Завістовіч, прэпаратар А. К. Ціток з рызыкай для жыцця перанеслі іх на Віцебскую вуліцу і схавалі. Сюды ж праз некаторы час перанеслі частку хімікатаў хімічнага факультэта і рэшткі універсітэцкай бібліятэкі. Група Е. М. Зубковіча наладзіла сувязі з Мінскім падпольным цэнтрам, збірала і перадавала ў Маскву звесткі аб фашысцкіх войсках. У канцы чэрвеня 1944 года Зубковіч, Вязовіч, Завістовіч былі схопленыя і расстраляныя.

У падпольную камсамольскую арганізацыю «Андруша» ўваходзіў студэнт універсітэта Міхневіч. Потым ён узначаліў групу «Віктар», якая актыўна дзейнічала на заводзе імя Варашылава.

Студэнтка геафака І. А. Абрамовіч стварыла падпольную групу, члены якой уладкоўваліся працаваць на нафтабазу, збіралі важныя звесткі і перадавалі іх партызанам і падпольшчыкам. Жыццё гэтай слаўнай патрыёткі абарвалася ў Асвенціме.

Студэнт хімічнага факультэта Г. Фалевіч кіраваў падпольнай групай камсамольцаў, якая забяспечвала Мінскі падпольны абкам КП(б)Б медыкаментамі, шрыфтамі і звесткамі пра фашыстаў. У маі 1942 года члены групы былі расстраляныя.

Адным з кіраўнікоў камсамольскага падполля ў Віцебскай вобласці быў студэнт гістфака Белдзяржуніверсітэта Розня.

Прафесар І. Некрашэвіч у ліпені 1941 года стаў членам падпольнай камуністычнай групы, якой кіравала М. Б. Осіпава. З 1943 года да вызвалення Мінска навуковец быў у партызанах.

Актыўнай і бясстрашнай сувязной Мінскага партыйнага падполля была выкладчыца біяфака Л. А. Язубчык. Вялікая колькасць савецкіх патрыётаў была перапраўленая з яе дапамогай у партызанскія атрады.

Студэнтка філфака Л. Касцецкая ўваходзіла ў падпольную арганізацыю Полацка. Працуючы ў адной з нямецкіх устаноў, яна пастаўляла партызанам каштоўную інфармацыю. У кастрычніку 1942 года яна была растраляная.

Мужнасць і стойкасць выявіў прафесар А. Сталяроў: ён адмовіўся ад фашысцкіх абяцанак і пасля катаванняў быў пакараны смерцю.

Многія з тых, хто не паспеў эвакуіравацца ці ўступіць у шэрагі Чырвонай Арміі, сталі актыўнымі ўдзельнікамі партызанскага руху. Выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта У. А. Парахневіч узначаліў дыверсійную групу: з яго асабістым удзелам падрыўнікі пусцілі пад адхон 20 варожых эшалонаў, знішчылі шмат жывой сілы і тэхнікі ворага. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 сакавіка 1944 года Уладзіміру Аляксеевічу Парахневічу было нададзена званне Героя Савецкага Саюза.

У першыя дні вайны ў Беразіне студэнты гістфака Ф. Глінскі і В. Віткоўская стварылі падпольную групу, дзейнасць якой пачалася з прыёму зводак Савінфармбюро і распаўсюджвання рукапісных лістовак. Напрыканцы 1941 года пры актыўным удзеле Ф. Глінскага быў створаны партызанскі атрад. Пасля смерці Глінскага Віткоўская працягвала яго справу, але ў 1944 годзе за некалькі дзён да прыходу Чырвонай Арміі была расстраляная.

Студэнтка геафака Н. Ліставец у гады вайны ўзначаліла жаночы партызанскі атрад «Радзіма», які дзейнічаў на тэрыторыі Францыі.

Значная частка выхаванцаў і супрацоўнікаў універсітэта абараняла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

І. Лушчыцкі — выхаванец, а потым прафер універсітэта — быў старшым інструктарам палітаддзела дывізіі, потым корпуса, лектарам палітаддзела арміі. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ён быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Выпускнік гістфака, а затым яго дацэнт і дэкан П. З. Савачкін ваяваў на фронце ў якасці афіцэра разведкі дывізіі, потым корпуса. Яго подзвігі адзначаныя ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі.

Студэнт гістфака, а затым яго дацэнт і дэкан А. Сідарэнка ваяваў пад Сталінградам, з'яўляючыся намеснікам камандзіра танкавага батальёна па палітычнай частцы, быў цяжка паранены. Баявыя подзвігі Сідарэнкі адзначаныя ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі.

Афіцэрам дывізіённай, а потым корпуснай разведкі стаў аспірант, а пазней прафесар універсітэта Г. М. Трухноў, кавалер ордэнаў Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі. Ён удзельнічаў у буйных бітвах вайны: пад Сталінградам, на Курскай дузе, вызваляў Беларусь, Польшчу, удзельнічаў у Берлінскай бітве.

Многія не дажылі да Дня Перамогі, загінуўшы смерцю храбрых. У іх ліку студэнт геафака К. Некрашэвіч, дацэнт геафака Т. Смалярова і іншыя.

Тыя выкладчыкі і студэнты, якія паспелі эвакуіравацца ў тыл і не былі мабілізаваныя ў войска, сваім жыццём увасаблялі лозунг «Усё для фронта, усё для перамогі!»

Многія ўчорашнія студэнты і студэнткі сталі ў гады вайны настаўнікамі, дырэктарамі школ, камсамольскімі, прафсаюзнымі, партыйнымі работнікамі.

Педагагічныя калектывы школ у савецкім тыле ўзначальвалі выкладчыца Л. Фіглоўская, былая студэнтка М. Баранава.

Прафесар БДУ акадэмік Ю. А. Вейс выкладаў у Варонежскім сельскагаспадарчым інстытуце. Тут ён распрацаваў машыну для малацьбы хлеба, што ў дні вайны пры вострым недахопе працоўнай сілы ў калгасах было вельмі важна. Пасля захопу Варонежа фашысцкімі вайскамі Ю. А. Вейс эвакуіраваўся ў Свярдлоўск, дзе працаваў у сельскагаспадарчым інстытуце.

Акадэмік Годнеў загадваў кафедрай раслін у Свярдлоўскім сельскагаспадарчым інстытуце. Яго навуковая дзейнасць у час вайны была накіраваная на пошук дадатковых рэсурсаў харчавання за кошт павышэння прадукцыйнасці раслін. Апроч таго, ён працаваў над праблемамі ўплыву бора, марганца, медзі на рост, развіццё і выхад каўчука з кок-сагыза.

Загадчык кафедры БДУ прафесар Перцаў працаваў у педінстытуце ў Курску, потым загадваў кафедрай усеагульнай гісторыі ва Удмурцкім педінстытуце. У час вайны ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, часта выступаў з лекцыямі і дакладамі перад насельніцтвам.

Дарэчы, аб дакладах: іх працягвалі рабіць нават падчас вайны.

У сакавіку 1942 года ў Казані на першай у гады вайны сесіі АН СССР з навуковым дакладам «Фашызм і сярэднявечча» выступіў акадэмік прафесар Перцаў. Акадэмік прафесар У. І. Пічэта выступаў у друку з работамі па гісторыі славян.

У маі 1943 года прымаецца рашэнне аб узнаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Некаторыя факультэты і курсы размясціліся ў навучальных карпусах МДУ. Для астатніх факультэтаў быў перададзены будынак сярэдняй школы на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі, дзе універсітэт і знаходзіўся да пераезду ў Мінск. Прафесарска-выкладчыцкаму саставу прадаставілі 40 дачных дамкоў, размешчаных на гэтай самай станцыі.

11 кастрычніка 1943 года да заняткаў у БДУ прыступілі каля 300 студэнтаў. На 1 снежня ва універсітэце працавалі 40 выкладчыкаў, большасць з якіх былі ў БДУ яшчэ да вайны. Рэктарам быў прызначаны дацэнт П. П. Савіцкі.

1 жніўня 1944 года Белдзяржуніверсітэт вярнуўся ў Мінск. Становішча было надзвычай складаным: адзіным ацалелым будынкам быў фізіка-матэматычны корпус... Але ўсё было наперадзе. Вайна яшчэ працягвалася, а універсітэт ужо развіваўся, рос. Ён зноў станавіўся тым, чым павінен быў быць...

**Падрыхтаваў**
**Андрэй УЛАДЫКА,**
**студэнт І курса ФПМІ.**





Я люблю пакаленне нашых бабулек і дзядоў. Нават сёння, калі час на іх тварах пакінуў свае несціральныя прыкметы, бачу ў іх не проста крыніцу мудрасці.

Есць у іх, у тых хто перажыў цяжкую і жудасную вайну, такі стрыжань жывучасці, ёсць маладзецкі задор і юнацкая рамантыка. Бо не звыклі яны разменьвацца на дробязі. Быццам гора вайны, якое прыйшлося на іх юнацкія гады, зрабіла іх асабліва сталымі на ўсё жыццё. А як многа ў іх сэрцах пяшчоты і любові.

І ні з кім не бывае так цёпла, як з нашымі бабулямі і дзядулямі. І хочацца рукамі разгладжваць іх зморшчыны.

І шмат каго з іх няма ўжо з намі.

І растуць іх праўнукі.

Растуць і радуюцца жыццю. Растуць, каб упрыгожваць гэтую зямлю.

**Ю. ВАСІЛІШЫНА,**
**фота аўтара**

# ПЕРАМОГІ

## ● ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

1941 ГОД

Чэрвень. У першыя дні вайны 450 студэнтаў і выкладчыкаў БДУ з'явіліся на прызыўныя пункты.

28 чэрвеня. Нямецка-фашысцкія захопнікі акупавалі Мінск.

1943 ГОД

15 мая. Саўнаркам СССР прыняў Пастанову «Аб узнаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта» на станцыі Сходня пад Масквой.

15 верасня. Прынятая Пастанова СНК СССР «Аб памерах і парадку прызначэння стыпендый у ВНУ і тэхнікумах і вызваленні студэнтаў ад прызыву ў Чырвоную Армію».

18 верасня. Прынятая Пастанова СНК СССР «Аб парадку водпуску на навучанне ў ВНУ і тэхнікуме работнікаў абаронных і важных прамысловых прадпрыемстваў».

11 кастрычніка. На станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі ўзнавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Да вучобы на гістарычным, філалагічным, біялагічным, геаграфічным, хімічным, фізіка-матэматычным факультэтах прыступілі 289 студэнтаў. Заняткі вядуць 40 выкладчыкаў.

25—26 снежня. У Маскве ў зале Маскоўскай кансерваторыі адбылося ўрачыстае пасяджэнне вучонага савета БДУ, прысвечанае 25-годдзю БССР.

Снежань. Званне заслужанага дзеяча навукі Узбекскай ССР нададзена У. І. Пічэту.

*(Пачатак. Працяг на ст. 4).*



## ● НАШ КОНКУРС

# СУСТРЭЧЫ НА ЭЛЬБЕ

Вядома, што сустрэча рускіх і амерыканцаў (саюзныя войскі) адбылася 26 красавіка 1945 года ў горадзе Таргаў на Эльбе. Прыкладна ў гэтыя дні былі на Эльбе і другія сустрэчы. Аб дзвюх такіх і хочацца расказаць.

Сустрэча першая.

У маі 1944 года нямецкая армейская група «Цэнтр» прыступіла да выканання плана адпраўкі на тэрыторыю імперыі 40—50 тысяч падлеткаў з Беларусі з мэтай «... не толькі папярэдзіць узмацненне ваеннай магутнасці ворага, але таксама скараціць яго біялагічны патэнцыял у будучым» («Звязда», 1 лютага 1995 года).

І пацягнуліся на Захад эшалоны. У адным з іх у пачатку чэрвеня 1994 года аказаўся і я.

Наш лагер «Nord-1» знаходзіўся на паўночнай ускраіне горада Дэсаў, кіламетры за паўтара-два ад Эльбы. У лагеры ўтрымлівалася некалькі сотняў дзяцей, пераважна з Беларусі. Шэраг баракаў, вакол драцяная агароджа на высачэзных слупах, загнутых на бок лагера. Ля агароджы бункер-траншэя, абстаўленая бетоннымі блокамі, зверху прыкрытая імі ж і засыпаная зямлёй. Тут мы хаваліся падчас паветраных трывог. За агароджай размяшчаўся харчблок (кухня, як мы яе называлі), перад ёй — даволі вялікае поле, а ўдалечыні, кіламетры за два — два з паловай, праглядаўся лагер «Nord-3». У ім утрымліваліся італьянскія і французскія рабочыя (некаторыя з іх у нас працавалі майстрамі).

З вясны 1945 года паветраныя трывогі сталі рэгулярнымі і наогул усталяваўся такі рэжым: а 22 гадзіне — адбой, а 23 гадзіне — паветраная трывога, а 6 гадзіне — пад'ём, а 7-й — на працу.

Напрыканцы красавіка нас ужо не ганялі на працу — сярод немцаў назіраўся блізкі да панікі настрой. Аднак нас яшчэ крыху кармілі: адзін раз у дзень давалі нейкую бурду з сушаных бульбы і цыбулі.

У адзін з такіх дзён я ляжаў на ніжнім ярусе двухпавярховых нараў у сваім бараку. Раптам здалёку пачуліся нейкія выбухі. Усе, хто быў у бараку, ірвануліся ў бункер. Яшчэ некалькі выбухаў раздалося бліжэй, а затым усё сціхла. Адзін з нашых наглядальнікаў выглянуў з бункера і, вярнуўшыся, сказаў, што па полі ад лагера «Nord-3» рухаецца група салдат. Праз некалькі хвілін ён жа ўсхвалявана паведаміў: «Гэта амерыканцы!». І сапраўды, праз хвіліну-дзве амерыканскі танк разадраў дрот агароджы і падышоў да нашага барака, ткнуўся носам у яго сцяну, каб замаскіравацца, і адкрыў агонь па засецы, што была на супрацьлеглай вуліцы горада. Там жа амерыканцы паставілі мінамёт, які таксама зрабіў некалькі стрэлаў па засецы. Відаць, гэты мінамёт і патрывожыў наш лагер — правяраў ягоную рэакцыю.

Вельмі хутка усё сціхла. Што адбывалася там, наперадзе, мы не бачылі і, паколькі нас ужо ніхто не стрымліваў, вывалілі з бункера. Старэйшыя хлопцы адразу ж кінуліся да харчблока, а мы, меншыя, сталі дзівіцца на танк, мінамёт. Праз некалькі хвілін паўз нас правялі шэсць палонных немцаў з закінутымі за галовы рукамі.

Потым амерыканцы фатаграфалі нас і фатаграфаліся разам з намі.

Праз некаторы час я зайшоў у свой барак. Над падушкай, на якой знаходзілася мая галава перад абстрэлам, свяціліся дзве маленькія адтулінкі: амерыканская міна трапіла ў вугал суседняга барака, і два асколкі прабілі сцяну ў двух-трох сантыметрах вышэй падушкі.

Вось такой атрымалася мая першая сустрэча на Эльбе, сустрэча з амерыканцамі.

Сустрэча другая.

Прайшло некалькі дзён, нас ужо ніхто не карміў, ежу здабывалі хто як мог. Я адправіўся ў бок Эльбы. Пахадзіў па пералесках, узгорках, вакол азёрцаў — тут былі сляды чалавечага прабывання, хутчэй за ўсё — вайскоўцаў, бо валяліся ўсялякія салдацкія рэчы. Сярод іх я знайшоў надарваны пакет са смажаным ячменным кофе, пажаваў крыху — гарката. Успомніў, што старэйшыя хлопцы гаварылі: «Каля рэстарана «Паплавок» ля ракі можна чымсьці пажывіцца». Мне ў той час і ў галаву не прыйшло, што калі там ужо пабывалі нашы хлопцы, то знайсці там штонебудзь будзе немагчыма. Тым не менш я вырашыў схадзіць да «Паплаўка» і накіраваўся да Эльбы. Рака ў гэтым месцы робіць дугу і, паколькі левы бераг таксама нізінны, тут была насыпана дамба, каб вада не залівала гароды. Часткова дамба ішла на некаторай адлегласці ад берага, а часткова амаль што па беразе — два-тры метры ад лініі вады. Там, дзе дамба падыходзіла бліжэй да берага, ішла дарога. Праз дамбу можна было перайсці і апынуцца на беразе ракі.

Калі я падышоў да гэтага месца, то заўважыў, што, прыкрываючыся дамбай, там стаяла амерыканская машына. Мне запомніліся толькі «вусы», якія тырчалі над машынай (потым я даведаўся, што гэта быў «Додж 3/4»). Вакол сядзелі некалькі амерыканскіх салдат. Напэўна, гэта быў перадавы назіральны пункт.

Усё навокал было ціха і спакойна. Я некалькі хвілін дзівіўся на амерыканцаў, але яны на мяне не звярнулі аніякай увагі, затым перабраўся за дамбу і берагам пашыбаваў да «Паплаўка».

Адышоўшы каля 200—300 метраў ад амерыканскага патруля, я раптам пачуў нейкі гук, так ціха, спакойна: «Пок!» Зацікаўлены, я ўзбег на дамбу, паглядзеў — у адным месцы за дамбай быццам распаўзаўся шызы дымок, але ніякай ямкі, як пры выбуху, не было. Нічога не зразумеўшы, заспакоены, я наўскасяк збег з дамбы да ракі. Але не паспеў зрабіць і некалькі крокаў, як спераду, злева, пасярэдзіне Эльбы, пачаў ўзрастаць празрысты слуп вады.

Гука выбуху я не памятаю. Тут да мяне пачало ужо штосьці даходзіць, але я механічна зрабіў яшчэ крок ці два наперад. І тут метрах у 15—20 ад мяне, каля самага берага, пачаў вырастаць чорны слуп. Я нават пачуў подых вільгаці.

Вось цяпер да мяне ўжо ўсё дайшло! І не паспеў яшчэ гэты слуп узняцца канчаткова, як я развярнуўся і даў драла. Праскочыў міма амерыканцаў, краем вока заўважыў там толькі нейкую мітусню, і паімчаўся ў напрамку лагера. Ззаду усё яшчэ чуліся выбухі.

Хто страляў з таго боку Эльбы — не ведаю. Але стралялі, дакладна, па мне. Як мне тады пашанцавала, я ўсведаміў толькі ў час навучання ва ўніверсітэце на занятках па артылерыйскай падрыхтоўцы: першы стрэл «не назіраўся» (за дамбай не быў відзён), таму была ўзята самая вялікая «вілка», і трэці стрэл, які быў павінен стаць для мяне ракавым, аказаўся недакладным.

Вось такая была ў мяне другая сустрэча на Эльбе.

Дні праз два-тры пасля гэтага здарэння да нашага лагера дайшлі чуткі, што на тым баку Эльбы — рускія. Вялікай групай мы пайшлі да Эльбы ў тое самае месца, дзе быў пераход да берага. Ніякіх амерыканцаў там ужо не было. Адна з нашых старэйшых дзяўчат пераплыла на той бераг, каб паведаміць нашым аб тым, што тут знаходзіцца вялікая колькасць савецкіх дзяцей.

Праз некалькі дзён да нас у лагер прыехалі два савецкія афіцэры. А яшчэ праз некаторы час нас сабралі і прывялі да Эльбы, непадалёку ад узарванага маста, падагналі кацер з баржай і за некалькі рэйсаў пераправілі нас на правы, савецкі бераг.

К вечару мы сталі ўладкоўвацца ў ваенных казармах якогасьці гарадка. І тут пачулася: «Хлопцы! Там сухары даюць!» Мы кінуліся ў бліжэйшы лес: абознікі, сталыя, вусатыя савецкія салдаты, шчодрай рукою насыпалі ў падстаўленае намі крыссе салдацкія сухары.

Так пачалося з вясною 1945 года новае жыццё!

У тыя дні мне споўнілася 13 гадоў.

**Дацэнт хімфака**
**Р. ГУРЧАНКОЎ.**



## ● ЗАПРАШАЕМ НА ВЫСТАВУ

# «ГІСТОРЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ»

Аддзел рэдкіх і каштоўных кніг, адзін з 14 аддзелаў фундаментальнай бібліятэкі універсітэта, захоўвае найбольш каштоўную частку яе фонду. З мэтай раскрыцця зместу фонду, аказання дапамогі чытачам у яго выкарыстанні, аддзел сістэматычна вядзе экспазіцыйную работу.

Так, з пачатку года ў аддзеле пачала дэманстравацца выстава «Гісторыя Зямлі беларускай» — экспазіцыя выданняў Археаграфічнай Віленскай, Пецярбургскай, Кіеўскай камісій, Віцебскага цэнтральнага архіва і іншая літаратура.

Гэтыя навуковыя ўстановы былі створаныя і дзейнічалі ў XIX— пач. XX стагоддзяў. Займаліся яны зборам дакументальных гістарычных матэрыялаў, іх апісаннем і выданнем.

У рабоце вышэйназваных камісій удзельнічалі вядомыя гісторыкі таго часу: Кастамараў М. І., Салаўёў С. В., Бантыш-Камінскі М. М., С. М. і П. М. Строевы, у Віленскай камісіі Гарбачэўскі М. І., Шалковіч С. В., Спрогіс І. Я., Дабрынскі Ф. Н. і інш.

Бібліятэкай універсітэта за доўгія гады сабрана нямала цікавых выданняў, якія былі падрыхтаваны і выдадзены гэтымі ўстановамі.

На выставе прадстаўлены шматтомныя і асобныя выданні, зборы твораў, зборнікі, манаграфічныя працы, сярод якіх можна сустрэць летапісныя і гісторыка-юрыдычныя матэрыялы, крыніцы афіцыйнага паходжання (акты, дакументы), матэрыялы сацыяльна-эканамічнага, статыстычнага, этнаграфічнага і рэлігійнага характару.

Зместавыя каштоўнасці многіх з гэтых выданняў спалучаюцца з прыгожым мастацкім і паліграфічным афармленнем.

Можна зрабіць невялікі пералік выданняў з выставы:

1. Русские летописи: Полное собрание русских летописей \Изданное по высочайшему повелению Археографическою комиссиею.— С.-Петербург: (Тип. Ф. Елеонского и К⁰),

Т.16: Летописный сборник, именумый Летописью Авраамки.—1889.— 319 с.—б/ц.

2. Русские летописи: Полное собрание русских летописей/Изданное по высочайшему повелению Археографическою комиссиею.— С.-Петербург: Тип. М. А. Александрова,

Т.17: Западно-русские летописи.— 1907.—648 с.— б/ц.

У аддзеле захоўваюцца амаль усе тамы ПСРЛ, з іх тт. 16, 17, 32, 35, 38 асвятляюць гісторыю зямлі беларускай.

3. Акты, издаваемые Археографическою комиссиею, высочайше учреждённою в Вильне.— Вильна: Тип. Губ. Правления,

Т.2: Акты Брестского Земского суда.— 1867.— 361 с.—10 р. З гэтага выдання ў аддзеле захоўваецца 21 том з 37 выдадзеных.

4. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. — С.-Петербург: Тип. Э. Праца,

Т.2: 1599-1637.— 1865.—287 с.—б/ц.

У аддзеле захоўваюцца тамы гэтага выдання: 1, 2, 3, 4, 6, 7, 8, 9, 10, 12, 15.

5. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске, и изданные под редакциею архивaруса сего архива Созонова: Витебск: печатано в тип. губерн. правления, 1871.—374 с.— 4 р.

6. Белорусский архив.— М.: Тип. С. Селивановского,

Ч.1—1824.—147 с. (Его сиятельству, государственному канцлеру, графу Николаю Петровичу Румянцеву, Любителю и Покровителю Наук, Милостивейшему Государю усерднейшее приношение.)

7. Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств /Сост. пинским старостою С. Хвальчевским в 1552-1555 гг., Издание Виленской Археографической комиссией.— Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1884.— 714 с.— 10 р.

8. Добрянский Ф. Описание рукописей Виленской Публичной библиотеки, церковно-славянских и русских /Составил Ф. Добрянский.— Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1882.—533 с.— 4 р.

9. Ревизия Кобринской экономии /Сост. в 1563 году королевским ревизором Д. Сапегою, с присовокуплением актов Браславского Земского суда, относящихся к Кобринской Архимандрии.—Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1867.—387 с.— 6 р.

10. Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия.— Киев: Тип. Имп. Ун-та св. Владимира, 1896.—260 с.— 3 р.

У гэтым выданні прыплецена кніга «Довнор-Запольский М. Очерки истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII ст./Довнар-Запольский. — Киев: Типо-литография Высочайше утв. Товарищества И. Н. Кушнеров и К⁰ в Москве, 1891.— 170 с.— б/ц.

11. Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии /Сост. Н. Я. Никифоровский.— Витебск: Губернская тип., 1895.—552 с.— 3 р. 50 к.

Усе гэтыя выданні з'яўляюцца крыніцай для вывучэння айчыннай гісторыі (зямлі беларускай) і садзейнічаюць павышэнню адукацыі ў многіх галінах ведаў. Сёння мы маем патрэбу ведаць аб іх існаванні, нягледзячы на тое, што яны друкаваліся ў мінулым стагоддзі і адлюстроўвалі многія гістарычныя падзеі з пункту гледжання свайго часу.

**МІЦКЕВІЧ Л. П.,**
**заг. аддзела рэдкіх і каштоўных кніг**

● ГІСТАРЫЧНЫ

## КАЛЯНДАР

*(Працяг. Пачатак на ст. 3).*

19944 ГОД

Студзень. Прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта налічвае 4 акадэмікі, 18 прафесараў і 24 дацэнты, а ўсяго 65 чалавек.

3 ліпеня. Войскі 1-га і 3-га Беларускіх франтоў авалодалі Мінскам і вызвалілі сталіцу Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

11 жніўня. У Мінск са станцыі Сходня прыбыла першая група студэнтаў універсітэта — 26 чалавек. Пачаліся работы па ўзнаўленню БДУ.

15 жніўня. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР званне Героя Савецкага Саюза нададзена выпускніку універсітэта У. А. Парахневічу.

Жнівень. У Мінску праведзеныя два буйныя агульнагарадскія суботнікі, у якіх сярод 50 тысяч працоўных удзельнічалі і студэнты БДУ.

1 верасня. Створаны факультэт журналістыкі і кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

Кастрычнік. У БДУ навучаюцца 743 студэнты.

Лістапад. Да навучальнай і навуковай работы ў БДУ прыступілі каля 20 прафесараў і 40 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Пачала працаваць універсітэцкая бібліятэка. ВНУ Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў падарылі бібліятэцы каля 25 тысяч кніг.

1945 ГОД

24 сакавіка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР званне Героя Савецкага Саюза нададзена выпускніку універсітэта М. П. Катлаўцу (пасмяротна).

9 мая. Дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй.

19—23 мая. Адбылася навуковая сесія БДУ, прысвечаная ўзнаўленню работы універсітэта ў Мінску і ўдзелу яго супрацоўнікаў і студэнтаў ва ўзнаўленні народнай гаспадаркі БССР.

13 чэрвеня. Прынятая Пастанова СНК СССР аб ільготах для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія паступаюць у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы.

✷

● УСЕ НА

## АЎТАСАЛОН!

# Ударым аўтапрабегам...

**2—6 мая ў выставачным комплексе «Мінскэкспа» па праспекце Машэрава, 14 пройдзе Мінскі міжнародны аўтасалон. Якое дачыненне мае гэтая падзея да студэнтаў? Самае непасрэднае. Усе студэнты могуць скарыстаць магчымасць 5 мая наведаць гэтае цікавае мерапрыемства бясплатна — па студэнцкіх білетах.**

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**вучань 11 класа**
**сш № 55.**

# ГАСЦЁЎНЯ

# «Я бы выбрал Бельгию. Но...»



*В последних номерах «Беларускага універсітэта» читателям было предложено несколько бесед с разными людьми, но на одну тему — наше образование, с его достоинствами и недостатками. Мы предлагаем еще одно интервью на эту тему — со студентом факультета журналистики из Сенегала. Нром Усман Папа в этом году заканчивает своё образование. Он говорит, что, когда вернется домой, обязательно напишет книгу о своей жизни сначала в перестроечном СССР, затем СНГ... Может это интервью будет упомянуто в книге, но на всякий случай мы публикуем его на страницах «БУ».*

**— Усман, почему ты приехал сюда? Случайность, личное желание или еще какая-то причина определили твой приезд?**

— Всё началось с того, что в университете, где я учился, начались студенческие забастовки. Учёба остановилась. И тогда я подумал: почему я должен сидеть здесь? Есть же возможность уехать куда-нибудь. А возможности были такие: Бельгия или СССР. В Бельгию я уже опоздал, оставался Советский Союз. Тогда у меня были совершенно другие взгляды на эту страну, в связи с пропагандой, которая велась у нас. Я боялся: что это такое — Советский Союз? Но с другой стороны, понравилась мне эпоха перестройки, которая перевернула мир. И я решился и поехал.

**— Каковы же были твои первые впечатления?**

— До своего приезда я считал, что СССР — это вторая держава после Америки. А приехал... Во первых, такая грязь! Во-вторых, люди злые, невеселые... И я сказал себе: слушай, ведь это вроде бы Европа, но смотри, какая грязь! Мой Дакар показался мне намного чище...

**— Усман, а если мы сравним два университета: тот, который ты оставил, и наш. Многому ли ты удивлялся?**

— Начнем с поступления. Как оказалось, это очень легко, по сравнению с французской системой — это очень легко. Если ты не ленив, то сиди и читай, что тебе дали. А у нас, не зависимо от того, дали студенту нужный материал или нет, но он должен ответить на поставленный вопрос.

Что меня еще удивило? Как по-разному преподаватели относятся к студентам.

**— А на чем основана эта разница?**

— Возможно, личные симпатии или антипатии... Или, вот, мой личный пример. Сижу на экзамене. Я знаю, что я кое-что знаю. Но преподаватель спрашивает меня, что я получил по практике. Я отвечаю: четыре. А он говорит: «Ну, тогда я поставлю тебе четыре. Ты студент хороший, но поздно пришел — все пятерки я уже роздал». Ради бога! Пусть будет четверка! Главное ведь — что в голове.

**— Кстати о голове. Усман, за те пять лет, которые ты провел здесь, ты получил понятие о профессии. Ты получил то, что хотел?**

— Я это получил уже давно — два года назад. Четвертый, пятый курс были, скажем так, «народные гуляния». Я бы закончил этот факультет два года назад, уехал бы домой и уже б работал.

**— То есть, несмотря на два года «народного гуляния» ты уверен в том, что, вернувшись домой, ты сможешь работать в газете?**

— Да, абсолютно.

**— Но, если бы ты стал деканом факультета журналистики, ты бы изменил что-нибудь?**

— Первым делом, я бы ввел побольше предметов, касающихся непосредственно профессии. Далее, побольше практики. Среди моих однокурсников есть такие, которые вообще ничего не знают о профессии журналиста. Больше практики надо! Не посылать студентов в редакции газет, а все делать на месте. Чтобы мы знали, как журналист может радоваться после своего материала и страдать.

**— Подожди, Усман, в чем проблема? Сотрудничай с газетой, печатайся, а потом радуйся и страдай!**

— Видишь ли, все получается не так. Прихожу я в редакцию, мне дают задание и говорят: принесешь материал через такое-то время. Я иду домой, пишу материал, а потом приношу его. То есть я занимаюсь «кабинетной» журналистикой.

**— Ты не участвуешь в процессе?**

— Абсолютно. Журналистам некогда мной заниматься...

**— А на факультете твоими профессиональными стремлениями тоже не очень интересуются...**

— Был такой эпизод. На лекции по белорусской истории преподаватель задал нам какой-то вопрос о редактировании. Случайно зашел разговор. Мы молчим, потому что не знаем. На пятом курсе. И тогда он нам предложил остаток лекции провести по редактированию. Мы решили, что это нам нужнее, чем белорусская история, и согласились. Слава богу, я стал что-то знать об этом.

**— Усман, если подытожить наш разговор о твоем образовании, получается: у тебя теоретическое представление о профессии журналиста, а практические навыки?..**

— А практические навыки... Ну так... Не глубоко. Хотя я старался работать. Не могу сказать, что делал все, что мог — мог бы и больше. Но то, что нужно было,— выполнил.

**— Скажи, если бы вернулось время, и ты снова стоял перед выбором: Бельгия или СССР, что бы ты выбрал?**

— Гм... Я бы выбрал Бельгию. Но тот жизненный опыт, который я получил в этой стране, наверное, я не приобрел бы ни в какой стране мира...

**Записала**
**М. ГУЛЯЕВА**

● НАШ ФОТАКОНКУРС









**У лясах**
**Чужынцаў косці**
**Дагніваюць.**
**А былых салдатаў**
**Кулі**
**Даганяюць.**

**Не закрыцца**
**Ні акопам,**
**Ні бранёю,**
**Ні мінулай**
**Пераможнаю**
**Вайною.**

**Тыя кулі,**
**Што калісь**
**Заселі ў целе,**
**Даляцелі ўсё ж**
**Да сэрца,**
**Даляцелі...**

*Генадзь БУРАЎКІН*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

27 красавіка
Зак. 655.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК